**УДК 262.3(061/068)(476)(043.3)**

# ГІСТОРЫЯ ЎЗАЕМААДНОСІН ПОЛАЦКІХ АРХІЕПІСКАПАЎ ВАСІЛЯ ЛУЖЫНСКАГА І СМАРАГДА КРЫЖАНОЎСКАГА ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПОЛАЦКІХ І ЛІТОЎСКІХ ЕПАРХІЯЛЬНЫХ ВЕДАМАСЦЕЙ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

*В.Г. РЫМКО*
**Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Прадстаўлены аналіз матэрыялаў размешчаных на старонках Полацкіх і Літоўскіх епархіяльных ведамасцей (другая палова XIX – пачатак XX ст.) і прысвечаны гісторыі ўзаемаадносін полацкіх архіепіскапаў Васіля Лужынскага і Смарагда Крыжаноўскага. Дзейнасць гэтых пастыраў у Полацкай епархіі праходзіла ў даволі складаны час і ў супярэчлівых абставінах, бо 20–30-я гг. XIX ст. у рэлігійным жыцці беларусаў характарызаваліся працэсамі, звязанымі з ліквідацыяй уніяцтва і ўз'яднаннем грэка-католікаў з праваслаўнай царквой. Такімі ж супярэчлівымі былі і адносіны ўніяцкага архіпастыра В. Лужынскага і праваслаўнага ўладыкі С. Крыжаноўскага, якія імкнуліся да пазначаных мэтаў кардынальна рознымі шляхамі.*

*Нягледзячы на тое, што епархіяльныя ведамасці з'яўляліся афіцыйным друкаваным выданнем праваслаўнай царквы ў Расійскай імперыі, сімпатыі аўтараў публікацый аказаліся на баку ўніяцкага архіепіскапа В. Лужынскага, а дзейнасць яго праваслаўнага апанента была імі раскрытыкавана.*

**Уводзіны.** Афіцыйнае перыядычнае выданне праваслаўнай царквы – епархіяльныя ведамасці – пачало выходзіць на беларускіх землях у 1863 г., калі з'явіўся першы нумар «Літоўскіх епахіяльных ведамасцей». Пазней такія ж часопісы з'явіліся і ў астатніх чатырох беларускіх епархіях: «Мінскія епархіяльныя ведамасці» – у 1868 г., «Полацкія епархіяльныя ведамасці» – у 1874 г., «Магілёўскія епархіяльныя ведамасці» – у 1883 г., «Гродзенскія епархіяльныя ведамасці» – у 1901 г. Усе названыя ведамасці, якія выдаваліся да пачатку XX ст., утрымліваюць каштоўныя і цікавыя матэрыялы па царкоўнай гісторыі і, у прыватнасці, па гісторыі грэка-каталіцкай царквы. Адным з вострых пытанняў, якія разглядаліся на старонках беларускіх епархіяльных ведамасцей, сталі ўзаемаадносіны двух полацкіх архіепіскапаў – уніяцкага Васіля Лужынскага і праваслаўнага Смарагада Крыжаноўскага. Згодна публікацыям Полацкіх і Літоўскіх епархіяльных ведамасцей і асабістым лістам С. Крыжаноўскага зносіны паміж названымі пастырамі былі складанымі, напружанымі і нават насілі падкрэслена варожы характар, хаця як С. Крыжаноўскі, так і В. Лужынскі ўрэшце імкнуліся да здзяйснення адной і той жа мэты – далучыць уніятаў да праваслаўя.

**Асноўная частка.** Архіепіскап Смарагд кіраваў Полацкай праваслаўнай епархіяй у перыяд з 1833 па 1837 гг. У «Полацкіх епархіяльных ведамасцях» было надрукавана «Слово» С. Крыжаноўскага, сказанае ім падчас уступлення ў кіраванне епархіяй у полацкім Сафійскім саборы [1], у якім ён нагадаў сваёй пастве, што праваслаўны епіскап на Полацкай кафедры – гэта не новая падзея, а толькі зварот да далёкага мінулага, калі «православные епископы от глубокой древности непрерывно и преемственно поставляемы были до 1661 года, когда последний из них насилием и нетерпимостью западнаго властолюбиваго духа вытеснен был из града сего» [1, с. 906]. Адметны зварот епіскапа Смарагда да полацкіх уніятаў: «Любезные братия и сестры униатскаго исповедания. Знаю, что вы невиновны в отпадении от святой восточной кафолической церкви. Знаю, что враг с своими исчадиями сотвори сие чрез тяжкия насилия, причиненныя предкам вашим» [1, с. 908]. Аднак ён даволі жорстка адносіўся да ўніятаў, карыстаючыся тым, што праваслаўе было пануючай рэлігіяй у Расійскай імперыі, і часам гвалтоўна пераводзіў уніяцкія прыходы ў праваслаўе. Гэтым ён значна адцягваў і разбураў уз'яднальныя планы ўніяцкіх пастыраў і асабліва архіепіскапа В. Лужынскага. Прымушаемыя да ўз'яднання, уніяты негнатыўна настройваліся ў адносінах да праваслаўя і нават сталі глядзець у бок каталіцтва.

Дадзеныя падзеі падцвярджаюць і лісты епіскапа Смарагда да обер-пракурора Свяцейшага Сінода С.Д. Нячаева за 1833–1838 гг. аб асобных уз'яднаннях уніятаў. Прывядзём некалькі цытат: «прибыл я в Полоцк и положил доброе начало присоединения (через одного из благочинных) 280 душ мужеска и 300 душ женского пола к Православию»; «униатские ксендзы сильно расстраивают и искушают новоприсоединившихся из унии к Православию около 4-х тысяч душ христиан (с двумя приходскими церквами), решился и лично утвердить оных христиан в Православии…по разным уездам Витебской губернии в моем присутствии и при моем посильном старании присоединено около 3-х тысяч душ обоего пола, с двумя приходскими деревянными и одною домашнею каменною церквами…Перед выездом моим из Полоцка учинил я распоряжение к присоединению нескольких деревень в Полоцком уезде из унии ко бла-

гочестию и, по прибытии моем, сейчас узнал, что распоряжение мое увенчалось успехом: ибо и здесь обращено в православие 913 душ обоего пола, с двумя домашними церквами» [2, с. 446–448].

Усё гэта паставіла сімпатыі праваслаўных даследчыкаў і аўтараў публікацый у епархіяльных ведамасцях на бок В. Лужынскага, які дзейнічаў на карысць праваслаўя больш, чым епіскап Смарагд.

Гэтыя ж факты адзначаны і ў працы Г. Шавельскага «Два возсоединителя – епископы Смарагд (Крыжановский) и Василий (Лужинский)» [3]. Па словах аўтара, аднаўленне Полацкай праваслаўнай епархіі ў 1833 г. адбылося калі «правительство окончательно решило вопрос о возсоединении униатов» [3, с. 228]. Архіепіскап Літоўскі Іосіф Сямашка – ініцыятар і кіраўнік уз’яднальных працэсаў – быў незадаволены прызначэннем на Полоцкую кафедру праваслаўнага епіскапа, так як гэта «вводило в начатое дело, совершенно не посвященнаго в тайны возсоединения, деятеля, который, может быть, захочет пойти своим путем, не признавая авторитетов и, благодаря этому, явится тормозом в великом начинании» [3, с. 229]. Прадчуванні І. Сямашкі апраўдаліся цалкам, але спраўляцца з наступствамі прызначэння С. Крыжаноўскага прыйшлося перш за ўсё В. Лужынскаму, які прыбыў у Полацк таксама ў 1833 г. «для учинения зависящих распоряжений по благоустройству по части, относящейся к духовенству, равно как и для принятия в ведение и непосредственное управление имений полоцких архиепископов» [3, с. 230].

Уніяцкі ўладыка «встретил православнаго епископа с добрыми чувствами, любезно согласился устроить его в своем Струнском имении, без всяких вознаграждений, отремонтировал дом» [3, с. 231]. Епіскап Смарагд наадварот бачыў у любым узвышэнні Лужынскага «повод к большей неприязни и к новым нападениям» [3, с. 231]. Ён стаў схіляць струнскіх прыхаджан-уніятаў да праваслаўя і хутка аб’явіў, што ў В. Лужынскага належыць адабраць яго маёнтак і царкву ў Струнні і перадаць праваслаўным. Не абмежаваўшыся гэтым, Смарагд і падначаленае яму святарства сталі складаць на В. Лужынскага даносы аб недахопах па кіраванню струнскім маёнткам і пра ўціск сялян. Следства па гэтай справе паказала нявіннасць В. Лужанскага, але пакуль яно цягнулася ўладыке «пришлось пережить много опасений, неприятностей и оскорблений» [3, с. 425].

Уступіўшы ў кіраванне сваёй кафедрай, уладыка Смарагд «всецело отдался делу присоединения униатских приходов к православию» [3, с. 282], аднак погляды на ўз’яднанне уніятаў у В. Лужынскага і С. Крыжаноўскага былі зусім супрацьлеглымі. Смарагд быў на баку адзінкавага асобнага ўз’яднання, лічыў усеагульнае ўз’яднанне справай далёкай будучыні. Нават лісты самога епіскапа Смарагда да оберпракурора С.Д. Нячаева кажуць пра тое, што яго абвінавачвалі ў залішняй таропкасці ў справе вяртання ўніятаў у праваслаўе: «отношением своим касательно излишней и вредной торопливости в обращении униатов погружен я был в чрезмерную скорбь…Не знаю, откуда происходит столь твердая уверенность в торопливости нашей?» [2, с. 457].

Епіскап Васіль, пасвечаны ў планы І. Сямашкі і расійскага кіраўніцтва па дадзеным пытанні, насупраць, рыхтаваўся да аднаактнага ўз’яднання ўсіх уніятаў. Акрамя таго, метады, якія выкарыстоўваў епіскап Смарагд у адносінах да ўніятаў былі недапушчальнымі і настройвалі іх як супраць яго асабіста, так і супраць праваслаўя: сялянам абяцалі розныя ільготы ў павіннасцях, апеку ўрада і нават вызваленне ад прыгону, калі яны прымуць праваслаўе, што з самага пачатку было няпраўдай; уніяцкія святары, пазбаўленыя сваіх прыходаў у выніку пераводу іх паствы ў праваслаўе, вымушаны былі пакідаць не толькі храмы, але і дамы, «скитались без крова и приюта» [3, с. 422], прычым часта гэта былі святары, якія далі падпіскі са згодай на далучэнне сваёй паствы да праваслаўя, але Смарагд лічыў іх неблаганадзейнымі; часта ва ўніятаў адбіралася адзіная на дадзенай тэрыторыі царква, хаця праваслаўных храмаў у гэтым раёне было больш чым дастаткова [3, с. 468]; за адмову аддаць упаўнаважаным епіскапа Смарагда ключы ад уніяцкіх цэркваў настаяцелі і панамары арыштоўваліся, ім пагражалі высылкай у Сібір [3, с. 470]. У сувязі з усім гэтым у 1835 г. у межах Полацкай епархіі адбываліся значныя сялянскія хваляванні.

Васіль Лужынскі ў сваю чаргу быў намераны «паству свою вести осторожно и постепенно чрез преобразование унитской церкви с ея обрядностью, перевоспитание униатскаго народа чрез расположение к православию и перевоспитание униатскаго духовенства» [3, с. 326].

У стварэнні канфліктнай сітуацыі немалую ролю адыгралі асабістыя якасці абодвух супраціўнікаў: «характер Смарагда менее всего был пригоден для добрых отношений. Резкий, неугомонный, не терпящий чужих мнений, без меры самолюбивый, хотя и не всегда дальновидный» [3, с. 327], В. Лужынскі «также был не из самых счастливых натур в этом отношении. Его неровность характера, переходившая то в излишнюю строгость, то в ненужную снисходительность, то неосторожность в словах и действиях, его наклонность к светским развлечениям, к пышности и блеску – все это могло служить частым поводом для нареканий, упреков, обид и обвинений» [3, с. 327]. Імператар Мікалай І, які быў пасвечаны ў праект І. Сямашкі, загадаў праваслаўнаму епіскапу спыніць «нетактичную и вредную деятельность православных возсоединений» [3, с. 368]. Гэта моцна закранула самалюбства Смарагда, які, не маючы магчымасці нічога абвергнуць в вышэйшых колах улады, звярнуў сваю помсту супраць В. Лужынскага ў выглядзе шматлікіх судовых спраў. Прывядзём вытрымкі з лістоў епіскапа Смарагда

С.Д. Нячаеву: «езерийский волостной голова…противодействовал Православию, по настройству одного униатского прелата. Это наш Г. Бискуп Лужинский, сильно противящийся нашим обращениям униат…Ныне же Г. Бискуп в обоестороннем положении: хочет угодить полякам и в то же время не хочет казаться и к нам явно неблагоприятствующим» [2, с. 459]; «здешнее униатское начальство все еще мало успевает в сближении униатов с православием, как по малому о сем старанию, так и по причине посторонних препятствий, наипаче от католиков происходящих…Знаю я, что от униатского начальства поступают донесения совсем другого рода; при всем том фанатизм не умаляется, и я по совести, и перед Богом, не усматриваю в Полоцким униатах искреннего стремления к присоединению» [2, с. 463–464].

Трэба адзначыць, што ўніяцкія пастыры знаёмілі С. Крыжаноўскага са сваім праектам уз’яднання і ён пасля кожнай размовы абяцаў дзейнічаць у рэчышчы агульнай стратэгіі, але ў выніку аказвалася, што ён не быў шчырым і абвінавачваў і В. Лужынскага, і І. Сямашку ў ілжывасці і крывадушнасці: «оба они ничего совершенно не делая в пользу православия, желают только казаться пред правительством расположенными к оному, а между тем всю надежду возлагают на фальшивую политику некоторых важных лиц и на перемену обстоятельств» [3, с. 513]. Аўтар публікацыі адзначаў, што толькі ў канцы сваёй пастырскай дзейнасці ў Полацкай епархіі ўладыка Смарагд усвядоміў, «что система его была ненадежна и некоторые его действия были не нужны и начал работу в примирительном духе» [3, с. 514].

У «Літоўскіх епархіяльных ведамасцях» за 1891 г. быў надрукаваны артыкул «Переписка епископа Полоцкаго Смарагда» [4]. Восем лістоў С. Крыжаноўскага да Івана Глушкова, кіраўніка канцэлярыі смаленскага, віцебскага і магілёўскага генерал-губернатара, уяўлялі «большой интерес, как исторический материал, очерчивающие означенную деятельность епископа Смарагда и те общественные условия, в коих она имела место» [4, с. 104]. Рэдактары правялі аналіз гэтых лістоў, з якіх бачна, што ўжо ў 1834 г. «уния расползается по швам» [4, с. 104], прычым Глушкоў прыпісваў гэтую заслугу дзейнасці епіскапа Смарагда. Таксама С. Крыжаноўскі паведамляў, што у 1834 г. на Полацкай уніяцкай кафедры мелася некалькі чалавек, якія жадалі перайсці ў праваслаўе, і што, нягледзячы на падпіскі, якія ўніяты давалі на карысць праваслаўя, «усердия к православию в сердцах их не видно» [4, с. 104].

Апанент архіепіскапа Смарагда В. Лужынскі памёр на 88 годзе жыцця ў 1879 г. у Санкт-Пецярбурзе, з’яўляючыся праваслаўным пастырам і членам Свяцейшага Сінода. У сувязі з гэтым у «Полацкіх епархяльных ведамасцях» былі размешчаны публікацыі, прысвечаныя знакамітаму дзеячу ўз’яднання [5]. У некралозе прыведзены звесткі аб прыбыцці цела В. Лужынскага ў Полацк і пра тое, якім чынам павінна была адбыцца яго сустрэча і якія службы неабходна было адслужыць, а таксама данясенне полацкага благачыннага Акімава пра паніхіду «при проследовании тела Архиепископа Василия, на станции железной дороги в Полоцке» [5, с. 92].

У наступным нумары «Полацкіх епархяльных ведамасцей» і ў «Літоўскіх епархяльных ведамасцях» за 1879 г. быў надрукаваны артыкул М. Каяловіча, таксама прысвечаны памяці В. Лужынскага [6–7]. Аўтар пазітыўна ацэньваў яго дзейнасць, пачынаючы з факта дапамогі «жестоко несчастному последователю Лисовскаго – полоцкому архиепископу Красовскому» [7, с. 122]. У 1834 г. ён даў падпіску аб пераходзе ў праваслаўе разам з іншымі знакамітымі ўніяцкімі дзеячамі. Пры гэтым М. Каяловіч адзначыў, што «этой подписки никто не требовал. Это было просто требование совести» [7, с. 124].

**Такім чынам**, падчас уз’яднальных працэсаў уніятаў з праваслаўнай царквой у пачатку XIX ст. на Полацкай зямлі дзейнічалі дзве епархіі: уніяцкая на чале з архіепіскапам Васілём Лужынскім і праваслаўная на чале са Смарагдам Крыжаноўскім. Першая пачала сваю дзейнасць адразу пасля Брэсцкага царкоўнага сабора 1596 г., другая была адноўлена ў 1833 г. Нягледзячы на тое, што ўладыка Смарагд называў уніятаў братамі па веры, абыходзіўся ён з імі даволі жорстка. Карыстаючыся тым, што праваслаўе было дзяржаўнай рэлігіяй у Расійскай імперыі, ён часам гвалтоўна вяртаў уніяцкія прыходы ў праваслаўе, не зважаючы на жаданне святара і прыхажан. Гэтымі дзеяннямі ён значна адцягваў і разбураў уз’яднальныя планы ўнияцкіях пастыраў І. Сямашкі, А. Зубко і асабліва полацкага ўніяцкага архіепіскапа В. Лужынскага. Незадаволеныя прымусам з боку праваслаўнага ўладыкі, уніяты негатыўна настройваліся супраць праваслаўя і нават пачалі глядзець у бок каталіцтва. Гэтыя факты паставілі сімпатыі даследчыкаў і аўтараў публікацый епархіяльных ведамасцей на бок В. Лужынскага, які дзейнічаў на карысць праваслаўя і ўз’яднання ўніятаў больш, чым С. Крыжаноўскі.

ЛІТАРАТУРА


1. Слово Преосвященнейшаго Смарагда, Епископа Полоцкаго и Виленскаго, говоренное им при вступлении в управление паствою в Полоцком Софийском соборе // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1891. – № 20. – С. 905–909.
2. Уния в документах : сб. / сост. В.А. Теплова, З.И. Зуева. – Минск : Лучи Софии, 1997. – 520 с.
3. Шавельский, Г. Два возсоединителя – епископы Смарагд (Крыжановский) и Василий (Лужинский) / Г. Шавельский // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1903. – № 7. – С. 228–231 ; № 8 – С. 282–285 ; № 9. – С. 324–327 ; № 10. – С. 368–371 ; № 11. – С. 422–425 ; № 12. – С. 468–472 ; № 13-14. – С. 508–515.

4. Переписка епископа Полоцкаго Смарагда // Литовские епархиальные ведомости. – 1891. – № 13. – С. 104–105.
5. Высокопреосвященный архиепископ Василий Лужинский (некролог) // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1879. – № 3. – С. 84–99.
6. Коялович, М. О почившем архиепископе Василие (Лужинском) / М. Коялович // Литовские епархиальные ведомости. – 1879. – № 7. – С. 50–52.
7. Коялович, М. О почившем архиепископе Василие (Лужинском) / М. Коялович // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1879. – № 4. – С. 122–130.

## THE HISTORY OF RELATIONSHIP OF POLOTSK ARCHBISHOP BASIL LUZHINSKY AND SMARAGD KRYZHANOVSKY ON THE MATERIALS OF POLOTSK AND LITHUANIAN DIOCESAN STATEMENTS OF THE SECOND HALF OF THE XIX - EARLY XX CENTURY

***V. RYMKO***

*The article presents an analysis of materials found on the pages of Polotsk and Lithuanian diocesan statements (second half of XIX – early XX century). And on the history of relations between the archbishops of Polotsk Basil Luzhinsky and Smaragd Kryzhanovsky. The activities of these pastors in the diocese of Polotsk took place in a rather difficult time in controversial circumstances as the 20-30-s XIX century in the religious lives of Belarusians were characterized by processes associated with the liquidation of the Uniate Church and the reunification of the Greek Catholics and the Orthodox Church. The same contradictory attitudes were Uniate Archbishop B. Luzhinsky and the Orthodox Bishop S. Kryzhanovsky, who aspired to the designated purposes radically different ways.*

*Despite the fact that the statements were diocesan official printed edition of the Orthodox Church in the Russian Empire, the sympathy of the authors of publications have appeared on the side of the Uniate Archbishop B. Luzhinsky, and the activities of his Orthodox opponents had criticized them.*

PolotskSU